# Мінскія выданні XIX стагоддзя па гісторыі

Л.І.Доўнар (Мінск)

Мінскія выданні, будучы ўніверсальнымі па свайму зместу і разнастайнымі па тыпалогіі, з'яўляюцца своеасаблівым і ўнікальным прадуктам свайго часу. Яны выступаюць у якасці мясцовых крыніц, рознабакова адлюстроўваючы сваю эпоху, і як дакументальныя помнікі ўдзельнічаюць у працэсе фарміравання гістарычнай памяці народа.

Аўтарамі мінскіх выданняў з'яўляюцца, у асноўным,прадстаўнікі мясцовай інтэлігенцыі. Гэта пацвярджаецца, у першую чаргу, у адносінах да кніг гістарычнай і краязнаўчай тэматыкі. З гістарычных прац, якія выйшлі ў мінскіх друкарнях XIX ст., можна адзначыць працы Г.Х.Татура, А.І.Слупскага, М.А.Гаўсмана,Ф.Ястрэмскага,А.Ельскага,М.І.Вержбаловіча, Н.Адо,А.П.Смародскага,К.А.Плаўскага і іншых.[1]

Старэйшае мінскае гістарычнае выданне - "Збор старажытных грамат і актаў гарадоў Мінскай губерні,праваслаўных манастыроў,цэркваў і па розных прадметах"(1848). Выданне было здзейснена ў Губернскай друкарні па ініцыятыве і на сродкі губернатара Мінска А.Сямёнава. Папярэдне па яго хадайніцтву была заснавана Часовая камісія для збору старажытных грамат,якія захоўваліся ў гарадскіх архівах і праваслаўных манастырах Мінскай губерні. Сабраны і выдадзены Камісіяй "Збор старажытных грамат..."адлюстроўвае прыхільнасць да прваслаўя, гвалтоўнасць уніі, рэлігійныя праследаванні прваслаўных і г.д. Мінскія граматы даволі шырока асвятляюць гісторыю гарадоў губерні, іх эканоміку, прывілеі на магдэбургскае права.[2] Вядома, што гэтае выданне знаходзілася ў кнігазборы У.Сыракомлі і выкарыстоўвалася ім для напісання нарыса " Мінск" ("Teka Wilieńska".1857. ч.1-2).[3]

"Збор старажытных грамат..." прадоўжыў традыцыю выдання "Беларускага архіва" Грыгаровіча, прысвяціўшы змест поўнасцю гісторыі Беларусі. Сярод мінскіх гістарычных выданняў XIX ст. вылучаюцца выданні па гісторыі царквы, гісторыі навучальных і ураднвых устаноў, грамадскіх арганізацый. Публікацыя гістарычных дакументаў знаходзілася пад уплывам адпаведных палітычных патрэб ураду. Ва ўжытак уводзіліся толькі тыя з іх, якія ў кожным канкрэтным выпадку былі выгаднымі замацаванню пануючай ідэалогіі. Афіцыйнае вывучэнне мясцовага жыцця з боку ураду давала магчымасць і мясцовай інтэлігенцыі займацца гісторыяй і краязнаўствам. Гэта было адзіным дазволеным шляхам фарміравання гістарычнай свядомасці народа.

70-80-ыя гады XIX ст. у Мінску адзначаны дзейнасцю аднаго з пачынальнікаў беларускай гісторыі і археалогіі Міхаіла Антонавіча Гаўсмана,аўтара "Гістарычнага нарыса мястэчка Турава,былой сталіцы ўдзельнага Тураўскага княства"(Мінск,1877). Мінская грамадскасць даволі часта знаёмілася праз "Мінскія губернскія ведамасці" з гісторыка-краязнаўчымі артыкуламі М.А.Гаўсмана пра Заслаўе, Мір, Мар'іну Горку, Навагрудак, Слуцк, Узду і інш. Гаўсман калекцыяніраваў прадметы старажытнасці з археалагічных раскопак побыту беларусаў, меў іх у хатнім музеі.[4] Ненадрукаванай засталася праца Гаўсмана "Гістарычны вопіс губернскага горада Мінска і губерні".[5]

Далучэнне грамадскасці да вывучэння і захавання помнікаў старажытнасці было на мэце і ў А.І.Слупскага, які з энтузіязмам выступаў рэдактарам і аўтарам у "Паўночна-Заходнім календары"(на 1892г.,на 1893г.).У 1888 годзе Губернская друкарня надрукавала яго гістарычны нарыс "Ізяслаў і Тураў - рассаднікі хрысціянства..." Шэраг яго прац прысвечаны Мінску,Магілёву, якія друкаваліся ў мінскіх перыядычных выданнях.[6]

Значны ўплыў на развіццё і станаўленне гістарычнай навукі зрабіў мінскі гісторык, археолаг, калекцыянер Генрык Татур. З 1874 г. Татур вёў археалагічныя раскопкі Мінскай губерні, склаў яе археалагічную карту з апісаннем помнікаў. У Мінску выдадзены "Нарысы археалагічных помнікаў на прасторы Мінскай губерні і яе археалагічнае значэнне"(1892). У рукапісах засталіся яго працы па Тураву, Заслаўю, Станькаву. Акрамя таго Г.Х.Татур меў багаты музей і унікальную бібліятэку рукапіснай і старадрукаванай кнігі.[7]

"Гісторыі Мінскай духоўнай семінарыі " прысвечана праца М.І.Вержбаловіча,выдадзеная адной з моцных друкарняў Мінска - Б.І.Саламонава, ў 1893 годзе. Да асвятлення гісторыі края далучыўся і выкладчык Мінскай гімназіі Аляксандр Паўлавіч Смародскі. Яго працы неаднаразова выдаваліся ў друкарнях Мінска - "Геаграфія Мінскай губерні"(1894), "Дзевяты археалагічны з'езд ў Вільні(і яго значэнне для Мінскай губерні)" (1893), "Дзесяць гадоў у жыцці Мінскай гімназіі"(1886),"Стагоддзе Мінскай губерні"(1892,1893).

Гісторыка-краязнаўчай тэматыцы прысвячаліся агляды мясцовасці, статыстыка-эканамічныя і фізіка-геаграфічныя нарысы, спісы населеных пунктаў і інш.,якія выдаваліся Мінскім губернскім статыстычным камітэтам і Губернскім праўленнем, а таксама друкалітаграфіямі Х.Дворца,

Е.Фрэнкеля. Рэгулярным выданнем Мінскага статыстычнага камітэта, пачынаючы з 1860 г. становіцца "Памятная кніжка Мінскай губерні", 39 выпускаў якой былі надрукаваны толькі ў XIX ст., а з 1882 г. - штогоднія "Агляды Мінскай губерні".[8] Звычайна чацвёрты аддзел "Памятнай кніжкі" прысвячаўся літаратурна-навуковым або гістарычным крыніцам па вывучэнню края. Артыкулы па гісторыі павятовых і губернскіх гарадоў займалі вядучае месца ў дадзеным выданні.

Перыядычны мінскі друк такcама служыць дадатковай гістарычнай крыніцай.[9] З аднаго боку афіцыйныя выданні,узнікшыя на падставе урадавых загадаў, абслугоўвалі яго патрэбы, з другога - былі амаль адзінымі дазволенымі друкамі, адлюстроўваючымі многія моманты грамадскага, культурнага і навуковага жыцця. Відавочна неабходнасць выкарыстання гэтых крыніц пры вывучэнні розных праблем гісторыі Беларусі.

Мінскім выданням XIX ст. па гісторыі характэрна:
- грунтаванне на мясцовым матэрыяле,
- даследаванне гістарычнага краязнаўства,
- мясцовае аўтарства.

Найбольшы выхад гістарычных выданняў прыпадае на другую палову XIX ст.,асабліва на канец XIX-пачатак XXстагоддзяў. Мясцовым выданням уласціва апісальная, статыстычна-канстатацыйная падача матэрыяла. Асноўным у іх змесце быў збор фактаграфічнага матэрыяла і яго сістэматызацыя. Аднак у 80-90-ыя гады ў гістарычнай літаратуры пачынаюць замацоўвацца элементы навуковага даследавання ў выглядзе сапастаў- лення фактаў,эканамічнай ацэнкі з'яў, уводзяцца абагульненні, вынікі.

Мясцовыя выданні патрабуюць крытычнага падыходу, уліку тэндэнцыёзнасці некаторых матэрыялаў.[10] Аднак ніяк не могуць быць выключаны з агульнагістарычнага працэсу, і павінны яго дапаўняць і разглядацца на этапе вывучэння развіцця і станаўлення гістарычнай навукі у Беларусі.

**Спасылкі:**

1. Кніга Беларусі.1517-1917: Зводны каталог/Склад.Г.Я.Галенчанка і інш. - Мн.,1986.- С.273-569.

2. Збралевич Л.И. Издание документов по истории Белоруссии в первой половине XIXвека / /Из истории книги,библиотечного дела и библиографии в Блоруссии.- Мн.,1972.- Вып.2.- С.115.

3. Мархель У. Кнігазбор Сыракомлі // Свіцязь. - Мн.,1989.-С.228.

4. Каханоўскі Г.А. Археалогія і гісторычнае краязнаўства Беларусі ў XVI- XIX стст.- Мн.,1984.- С.73-77.

5 Денисов В.Н. К истории одной неопубликованной книги //Книга в Белоруссии.- Мн.,1988.- С.123.

6. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі.Т.5.- Мн.,1987.-С.67.

7. Тамсама, С.249.

8 Мархель Л.І. Мінскія выданні ў XIX стагоддзі // Книга в Белоруссии. Книговедение, источники, библиография.- Мн.,1983. Вып.2.- С.19.

9. Улащик Н.Н." Минские губернские ведомости" как источник // Проблемы источниковедения.- 1959. - Т.VII.- С.112-150.

10 Збралевич Л.И. Местные издания Белоруссии и некоторые вопросы их изучения // Из истории книги, библиотечного дела и библиографии в Белоруссии.- Мн.,1970.- Вып.1.-С.136-149.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ